**Рэутовіч Я.М.**, *прафесар*

# АСАБЛІВАСЦІ ТВОРЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НАРОДНАГА МУЖЧЫНСКАГА ХОРУ ПАЛАЦА КУЛЬТУРЫ МІНСКАГА АЎТАЗАВОДА

Харавое мастацтва - найбольш старадаўняя галіна музычнай культуры, развіццё якой ажыццяўляецца на традыцыях народнай песнятворчасці. Цалкам звязаная з паэтычнай думкай, неабсяжная па вобразнаму дыяпазону (ад пяшчотнай лірыкі да мужнай грамадзянскай патэтыкі), харавая музыка з'яўляецца адным з найбольш дэмакратычных жанраў, якія адкрываюць перад выканаўцамі і слухачамі багацце чалавечых думак і пачуццяў.

Гэта характарызуе народны мужчынскі хор Палаца культуры Мінскага аўтазавода, аднаго з самых вядомых і знакамітых на Беларусі і за яе межамі. Калектыў быў створаны ў 1959 г. У першыя гады існавання ў яго складзе было 30-40 спевакоў, якія выконвалі не вельмі складаныя двух-трохгалосыя вакальна-харавыя творы. Але ўжо першыя выступленні хору на аглядах, конкурсах і фестывалях мастацкай самадзейнасці прыцягнулі ўвагу слухачоў, прафесійных хормайстраў і кампазітараў. Вялікую метадычную і практычную дапамогу калектыву і яго мастацкаму кіраўніку Мікалаю Ільічову ў той час аказалі вядомыя музыканты рэспублікі: У.Алоўнікаў, Ю.Семяняка, М.Маслаў, В.Роўда і інш. Хор пачаў паспяхова ажыццяўляць свой колькасны і якасны рост, удасканальваць музычна-ады-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кацыйную і вакальна-выканаўчую падрыхтоўку ўдзельнікаў, грунтоўна ўскладняць рэпертуар. У праграме загучалі такія творы, як «Шумяць бярозы» Р.Пуксту (сл. Я.Купалы), «Радзіма мая дарагая» У.Алоўнікава (сл. А.Бачылы), «Праметэй» К.Стэцэнкі (сл. А.Кавалёва), хор «Цішэй, цішэй» з оперы Дж.Вэрдзі «Рыгалета», «Хор паляўнічых» з оперы К.Вебера «Вольны стралок», хор «Паклёп» з оперы Д.Расіні «Севільскі цырульнік» і інш.

У 1965 г. хору прысвойваецца ганаровае званне «народны», а кіраўніку М.Іллічову - званне «заслужаны дзеяч культуры Беларусі».

У 1967 г. хор выступае ў Крамлёўскім Палацы з'ездаў, дзе атрымлівае медаль і дыплом лаўрэата мастацкай творчасці працоўных.

У 70-80-я гады калектыў працягвае працаваць над удасканаленнем выканаль-ніцкага майстэрства, ускладненнем рэпертуару. Гэтаму працэсу вельмі спрыяе актыўная канцэртная дзейнасць. З мастацтвам калектыву знаёмяцца не толькі жыхары Беларусі, але і Расіі, Літвы, Латвіі, Эстоніі, Украіны, Польшчы, Балгарыі, Германіі і іншых краін. У канцы 80-х - пачатку 90-х гадоў у рэпертуары налічвалася больш за 60 твораў рускіх і замежных класікаў, апрацовак і аранжыровак песень розных краін свету.

У цяперашні час, нягледзячы на вядомыя эканамічныя цяжкасці, народны мужчынскі хор Палаца культуры Мінскага аўтазавода рыхтуе новую канцэртную праграму для выступлення на Міжнародным фестывалі аматарскага вакальна-харавога мастацтва.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ